На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 182 (304)

Серада, 15 кастрычніка 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца

	Усход	Заход
Віцебск	7.28	18.03
Магілёў	7.25	18.30
Гомель	7.20	18.03
Мінск	7.36	18.15
Гродна	7.51	18.30
Брэст	7.49	18.33

Поўня 16 кастрычніка.

Роздум пасля мітынгу

"Талерантныя пескары" ў вокнах

Нягледзячы на дождж і парывісты вецер, некалькі тысяч прыхільнікаў Беларускага народнага фронту і незалежных прафсаюзаў выйшлі ў мінулую нядзелю на дэманстрацыю і мітынг пад галоўным лозунгам: "Не — голаду і холаду!". Яны прайшлі ад трактарнага завода да мікрараёна Серабранка, дзе і правялі мітынг. Дэманстранты скандзіравалі: "Свабоду Шыдлоўскаму!" — лідэру Маладога фронту. Яны неслі не толькі плакаты, але і красамоўныя вобразы пудзіл — вялізнага пеўня з доўгімі пёрамі, на якіх былі такія надпісы: "Абяшчаю, здзелаю, ашукаю" — і г.д., а таксама вусатага прусака-абжору.

Першым на мітынгу выступіў старшыня Вярхоўнага Савета 13-га склікання Сямён Шарэцкі, які востра крытыкаваў "дыктатарскі рэжым" за тое, што ён думае толькі аб адным — аб умацаванні сваёй улады, а не аб народзе. Аб цяжкасцях жыцця і ўсталяванні ў Беларусі антынароднага рэжыму гаварылі і іншыя прамоўцы.

Але мяне больш за ўсё ўразілі не дэманстрацыя і прамовы на мітынгу, а твары ў вокнах. Іх было вельмі многа. І ў мікрараёне трактарнага завода, і ў Серабранцы. У кожным доме, без перабольшвання.

Чакалася, што менавіта яны, рабочыя, выйдуць на дэманстрацыю і мітынг. Бо яны праводзіліся ў іх інтарэсах, як пратэст супраць нізкай зарплаты і цяжкага становішча рабочага чалавека. І праводзіліся не ў цэнтры горада, а ў мікрараёнах, дзе жывуць у асноўным працаўнікі прадпрыемстваў.

Але яны не выйшлі. Відаць, спужаліся. А тое, што жыхары згаданых мікрараёнаў ведалі пра акцыю і ў душы падтрымлівалі яе, красамоўна сведчылі твары ў большасці вокнаў.

Гэты штрых наводзіць на вельмі сур'ёзны роздум. Бо ён будзіць успамін і пра іншыя падобныя паводзіны. Мне да болі ўрэзалася ў сэрца тое, як у вёсцы праводзілі хлопцаў у армію ў той час, калі ішла вайна ў Афганістане. Праводзілі з песнямі і танцамі, з бубнамі і гармонікам. А куды ж праводзілі? Ды, па-сутнасці, на смерць. І не знайшоўся ні адзін бацька, які хоць бы запратэставаў супраць той вайны і адпраўкі сыноў на бойню. Што ж гэта за народ? Ды любая птушка будзе імкнуцца выдзяўбсці табе вока, калі ты наблізішся да кубла, дзе яе птушаняты. А гэтыя з песнямі і бубнам аддаюць сыноў на смерць.

Запомніўся выступ адной маці на адкрыцці помніка ў Троіцкім прадмесці. Яна дзякавала ўладам за помнік, да якога можа прыйсці і ўспомніць сына, які загінуў у Афганістане. Божа, за што ж дзякаваць? За тое, што паслалі на смерць сына і замест яго паставілі манумент? Што ж гэта за маці?

І вось цяпер. Зарплаты не хапае на хлеб і малако, не гаворачы ўжо пра яблыкі і апельсіны, якія так патрэбны дзецям, "пасыпаным" чарнобыльскім пеплам, а яны нават баяцца сказаць аб гэтым і баязліва пазіраюць з-за фіранак. Такія людзі нагадваюць "премудрого пескаря", які ўсё жыццё баяўся і дрыжэў, каб яго не зачапіў сваім вострым зубам шчупак. Так і прасядзеў усё жыццё ён у сваёй нары — не меў ні сяброў, ні сям'і, ні добрага харчавання, бо баяўся вылезці з той нары. Адзінае, што ён заслужыў, дык пахвалы самога шчупака, які, ці то смеючыся, ці то імкнучыся выманіць яго з нары, каб з'есці, казаў, які добры і разумны гэты "премудрый пескарь".

Я не дачакаўся канца мітынгу. Калі ад'ехаў на вуліцу Свярдлова, убачыў некалькі аўтобусаў і грузавікоў з міліцыяй, якія паварочвалі ў бок Серабранкі. Відаць, "АМАПаўскі шчупак" накіроўваўся туды, каб папужаць "премудрых" і талерантных пескароў, якія пазіралі за мітынгам з вокнаў сваіх нор-кватэр.

Як нам паведамілі ў штаб-кватэры БНФ, пасля мітынгу было затрымана 14 чалавек, у асноўным актывісты Маладога фронту.

Алесь ДРАБЧУК.

Стоп-кадр



Победительницей в одной из номинаций престижного Международного конкурса "Inter miss-97", который проходил в украинском городе Тернополе, стала студентка Витебского гуманитарного института Татьяна Мясоедова. Среди самых красивых девушек Украины, Польши, Чехии, Латвии и Грузии она была единственной представительницей нашей республики.

Фото Александра ХИТРОВА, БелТА.

Незалежная экспертыза

Уладзімір КУЛАЖАНКА, доктар эканамічных навук, прафесар

Не будзе прыватызацыі – знікнуць інвестыцыі



Дзяржаўная палітыка ў сферы прыватызацыі і рынычных пераўтварэнняў яскрава праявілася ў тым, што са створаных у папярэднія гады 46 спецыяльных інвестыцыйных фондаў (СІФаў), якія павінны былі быць пасрэднікамі трымальнікаў маёмасных чэкаў насельніцтва ў справе інвестыцый, засталося на сёння толькі 22. Сем з іх пазбаўлены ліцэнзій летам гэтага года, 17 — проста збанкрутавалі.

Чаму збанкрутавалі 24 спецыяльныя інвестыцыйныя фонды, альбо болей палавіны з іх, адказаць няцяжка. Галоўным чынам таму, што ўрад не меў і па сёння не мае сур'ёзнай праграмы прыватызацыі, а таму і намеру ажыццяўляць гэты працэс. Усе чакаюць указа прэзідэнта аб прыватызацыі, які ніяк не з'явіцца на божы свет. Ва ўрадзе, пэўна, забыліся пра дадзенае абавязацельства ў сумесным "Мемарандуме аб узаемаразуменні паміж урадам Беларусі і Сусветным банкам", дзе ў 43-ім артыкуле ёсць такі запіс: "Сусветны банк і ўрад згодны ў тым, што прыватызацыя не з'яўляецца пытаннем ідэалогіі. Паўсюдная прыватызацыя беларускіх прадпрыемстваў неабходная як практычны крок у адказ на ўсведамленне таго, што кіраўнікі прадпрыемстваў у Беларусі, як і ва ўсім свеце, нашмат эфектыўней кіруюць фондамі, якія знаходзяцца ў іх распараджэнні, калі асабіста ў гэтым зацікаўлены. Урад цвёрда прытрымліваецца канцэпцыі паскарэння тэмпаў акцыяніравання і прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў". Але, як сведчаць факты, паскарэнне тэмпаў прыватызацыі прызнаецца ўрадам толькі на паперы, а не ў жыцці. За 1995 і 1996 гады ў рэспубліцы было праведзена ўсяго 6 рэспубліканскіх чэкавых аўкцыёнаў, у якіх удзельнічала толькі 17 фондаў. Як тут развернешся? З гэтай прычыны спецыяльныя інвестыцыйныя фонды не выплачвалі дывідэндаў трымальнікам акцый, апроч аднаго СІФа — "Лясная прамысловасць". Цікавасць насельніцтва да СІФаў знізілася.

Да таго ж, інвестыцыйныя фонды настолькі абмежавалі, што працаваць прыбыткова яны не маглі і не могуць. Так, паводле заканадаўства, СІФы не могуць накіроўваць на набыццё каштоўных папер аднаго эмітэнта (прадпрыемства, якое выпускае акцыі) болей за 5% свайго капіталу і набываць болей за 10% акцый аднаго акцыянернага прадпрыемства. Не мае значэння, што набываць гэтыя акцыі выгадна. Забаронена таксама перапрадаваць акцыі з мэтаю атрымання прыбытку. Не дзіва, што пры гэтых і многіх іншых абмежаваннях інвестыцыйныя фонды, выконваючы сваю пасрэдніцкую ролю, сабралі толькі 28,9 мільёна чэкаў, або каля 7% атрыманых грамадзянамі, ды 17,7 мільёна чэкаў абмянялі на акцыі. Чакаць ажыўлення дзейнасці яшчэ ацалелых 22 СІФаў не даводзіцца. Ужо пачаўся апошні квартал года, а ўказа аб прыватызацыі як не было, так і няма, і ні аб якіх чэкавых аўкцыёнах ва ўрадзе нават і не думаюць.

Праўда, на мінулым тыдні адбылася спецыяльная нарада ва ўрадзе, дзе разглядалася пытанне аб паскарэнні прыватызацыі. Кіраўнік урада Сяргей Лінг выказаўся адносна таго, што за бліжэйшыя 10 дзён трэба падрыхтаваць указ аб прыватызацыі. Прэзідэнт яго падпіша, і ўсё пойдзе як трэба. А памочнік прэзідэнта па эканоміцы прафесар Пётр Капітула, падтрымліваючы прыватызацыю, выказаў думку, што за кошт актывізацыі толькі дзяржаўнага сектара, відаць, нельга дабіцца чакаемай эфектыўнасці грамадскай вытворчасці. Як бачна, ветразі прыватызацыі могуць змяніць курс. Толькі ўзнікаюць пытанні. Па-першае, аб прэзідэнцкім прыватызацыйным указе ўжо ідуць размовы не адзін месяц і раптам не хапае толькі 10 дзён. А па-другое, пакуль невядома, чым выклікана імкненне паскорыць прыватызацыю. Можа, толькі тым, каб стварыць пэўнае ўражанне і дабіцца фінансавання і крэдытавання еўрапейскімі і сусветнымі фінансавымі ўстановамі?

Дзяржаўныя адносіны да чэкавай прыватызацыі і дзейнасці інвестыцыйных фондаў сінхронна перадаюцца чэкатрымальнікам, якія не без падставы лічаць прыватызацыю і свой удзел у ёй бесперспектыўнай справай. З гэтай прычыны з 5,8 мільёна грамадзян, якім былі налічаны сертыфікаты, за іх атрыманнем звярнуліся амаль на 1 мільён чалавек меней.

Канешне, калі да чэкавай прыватызацыі адносіцца па-дзяржаўнаму, то дзейнасць хоць бы тых СІФаў, якія засталіся, трэба ўсяляк падтрымліваць. Бо як-ніяк, а насельніцтва атрымала на рукі 425 мільёнаў чэкаў, а канверсавала (абмяняла) пакуль 86 мільёнаў.

Як жа канверсаваць 339 мільёнаў чэкаў-ваўчэраў, якія яшчэ не пры справе на руках насельніцтва? Як сведчаць факты, урад пра гэта не думае. Бо каштоўныя паперы 122 прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў продажы, могуць абмяняць на акцыі толькі 27 мільёнаў чэкаў. А што рабіць людзям з астатнімі 300 мільёнамі чэкаў? Тут улады трымаюць своеасаблівую паўзу. На працягу апошніх 9 месяцаў урад не абнаўляе, значыць, не дапаўняе спісы акцыянерных таварыстваў. І прыватызацыя павісла ў паветры. Далейшае банкруцтва яшчэ дыхаючых СІФаў непазбежнае.

Сітуацыю на чэкавым рынку не выратоўвае тое, што ў сувязі з інфляцыяй днямі пастановай урада павышаны цэны іменнага прыватызацыйнага чэка да 100 тыс. рублёў.

Пратэст

Чаму маладыя патрыёты Беларусі Аляксей Шыдлоўскі і Вадзім Лабковіч утрымліваюцца за кратамі? Ці ж так трэба ставіцца да тых, хто любіць Радзіму?

Прадстаўніцы беларускага жаночага Руху за адраджэнне Айчыны накіравалі генеральнаму пракурору Беларусі Алегу Бажэлку петыцыю ў абарону двух арыштаваных у Стоўбцах маладых людзей — Аляксея Шыдлоўскага і Вадзіма Лабковіча.

Сярод падпісантаў — вядомыя дзеячы жаночых арганізацый Юлія Чыгір, Людміла Гразнова, Людміла Майсеня, Таццяна Ваніна і іншыя. Аўтары петыцыі выказалі рашучы пратэст супраць утрымання пад вартай 19-гадовага Аляксея Шыдлоўскага і 16-гадовага Вадзіма Лабковіча, якім пагражае "жорсткая судовая расправа", і патрабуюць іх неадкладнага вызвалення. "Мы — супраць пераследу сваіх дзяцей, якія любяць сваю Радзіму і хочуць жыць у свабоднай і дэмакратычнай краіне, — гаворыцца ў петыцыі. — Мы перакананыя, што гэтых юнакоў абвінавачваюць толькі за іх асабістыя перакананні і погляды".

Жанчыны таксама патрабуюць узбудзіць крымінальную справу супраць супрацоўнікаў Стаўбцоўскага РАУС за тое, што яны "кінулі за краты да крымінальнікаў вучня 11-га класа, якому неабходна вучыцца".

Жанчыны спрабавалі прайсці ў будынак рэспубліканскай пракуратуры, аднак іх спынілі супрацоўнікі міліцыі, якія заявілі, што генеральны пракурор адсутнічае. Дэлегацыю накіравалі ў прыёмную генеральнага пракурора, дзе яны і пакінулі гэты дакумент.

БелаПАН.

Да смешнага перастараліся чыноўнікі

У сваім ірвенні дагадзіць вярхам да смешнага перастараліся чыноўнікі адміністрацый Ленінскага і Першамайскага раёнаў Бабруйска. Ведаючы, што яны пастаянна забараняюць правядзенне ў горадзе любых акцый, гарадская арганізацыя Аб'яднанай грамадзянскай партыі падсунула ім цікавы ліст. Вось радкі з яго:

"Бобруйская городская организация Объединенной гражданской партии просит Вас дать разрешение на проведение пикетов по сбору подписей в поддержку вступления Республики Беларусь в Совет Европы. Дата проведения: 4 октября 1997 года".

Справа ў тым, што менавіта беларускія ўлады на чале з прэзідэнтам дабіваюцца ўступлення ў Савет Еўропы. Але ці то чыноўнікам невядома гэта, ці то ўжо так запраграміраваны, але і на гэты раз яны рашуча забаранілі акцыю. Так, выканаўчы камітэт адміністрацыі Ленінскага раёна вырашыў "запретить проведение пикетов по сбору подписей в поддержку вступления Республики Беларусь в Совет Европы". А адміністрацыя Першамайскага раёна патлумачыла: "Считаем нецелесообразным проведение данной акции в связи с непопулярностью данного вопроса у большинства населения Республики Беларусь".

Тут паўстае шэраг пытанняў. Выходзіць, што згаданыя адміністрацыі не падтрымліваюць прэзідэнта? Адкуль бабруйскія чыноўнікі ведаюць, што большасці насельніцтва Беларусі "да лямпачкі" гэты Савет Еўропы? Яны што, праводзілі апытанне насельніцтва? А калі так, калі большасць народа абыякава адносіцца да ўступлення Беларусі ў згаданы еўрапейскі орган, дык навошта прэзідэнт і яго каманда дамагаюцца гэтага?

Андрэй РУСАКОВІЧ.

Операция ГАИ

Езжайте тише! На вашем пути – пешеходы

В Минске по 31 октября 1997 года проходит операция для участников движения на улицах и дорогах под названием "Пешеход"

Пешеход — полноправный участник движения на улицах и дорогах. Он так же, как и водитель, несет ответственность за соблюдение требований Правил дорожного движения, обеспечение беспрепятственного проезда транспорта там, где не обозначены пешеходные переходы, и так же обязан подчиняться регулирующим сигналам светофора.

И все же нарушений ПДД со стороны пешеходов не уменьшается. Как и случаев их гибели в дорожных авариях и происшествиях.

В осеннее время в городе обострилась обстановка с обеспечением безопасности дорожного движения, о чем свидетельствует рост тяжести последствий ДТП. Количество погибших в дорожных авариях за сентябрь увеличилось на 10%. Основная часть пострадавших — пешеходы.

Вчитаемся в грустные данные статистики и задумаемся. За 9 месяцев в Минске произошло 513 ДТП, где 73 человека погибли и 516 ранены. По вине пешеходов произошло 39 аварий со смертельным исходом, а наезды на пешеходов составили 73% (374) от общего количества ДТП.

УГАИ ГУВД Мингорисполкома, изучив данную ситуацию, решило провести комплекс мероприятий под "кодовым" названием "Пешеход!".

Цель ее — уберечь пешеходов от поспешных решений не "там" перейти улицу, "обогнуть" троллейбус или автобус. А неизбежный результат такой спешки — "внезапные" наезды транспорта. Вот почему хочется воскликнуть: "Пешеходы, будьте внимательны!" А водителей — предупредить: "Осторожно: пешеход!" Будем же взаимно вежливы!

Виктор ВЫТЧЕНКОВ, госавтоинспектор ГАИ Центрального РУВД г.Минска.

SOS

Нясвіжскае малако аказалася небяспечным

У Нясвіжы вызначана ўспышка дызентэрыі. Як паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, толькі ў нядзелю ў медыцынскія пункты горада звярнулася 296 чалавек, прычым 238 з іх — дзеці. 217 хворых гаспіталізаваны. На шчасце, цяжкіх форм захворвання пакуль няма.

Медыкі мяркуюць, што фактарам узбуджэння дызентэрыі стала малочная прадукцыя мясцовага прадпрыемства, у якую трапіў вірус. З гэтай нагоды вытворчасць цэльнамалочных вырабаў (кефіра, малака, смятаны, тварагу) на Нясвіжскім малаказаводзе часова прыпынена.

Хрысціна ДВАРЭЦКАЯ.

Прэс-канферэнцыі

"Паляванне" на падлеткаў

Менавіта так можна ахарактарызаваць падзеі, якія разгортваліся пасля дэманстрацыі і мітынгу ў мінулую нядзелю. На прэс-канферэнцыі ў Беларускім народным фронце называліся шматлікія факты праследавання ўдзельнікаў акцыі. Пры гэтым падкрэслівалася, што было наладжана "паляванне" за лідэрамі Маладога фронту, схоплена некалькі школьнікаў.

Адзін відавочца расказваў, што яны групай ехалі з мітынгу ў тралейбусе № 30 у бок вакзала. Каля Чэрвенскага рынку трое ў цывільным пачалі выцягваць аднаго хлопца. Пасажыры заступіліся і адбілі яго. Ён выскачыў і збег. Тады яны прычапіліся да яго напарніка. Двое пацягнулі яго з тралейбуса на чарговым прыпынку, а трэці адбіваўся кулакамі ад натоўпу. Зацягнулі ў памяшканне і зачынілі дзверы. Было чутно, як падлетак крычаў. Група тых, хто пайшоў на выручку незнаёмцу, пачала грукаць у дзверы, але ніхто не рэагаваў. Абышлі памяшканне з другога боку, і там людзі сказалі: толькі што павалаклі адсюль акрываўленага хлопца.

Затым выступілі лідэры Маладога фронту Павел Севярынец і Яўген Скочка. Яны пасля мітынгу селі ў машыну і адразу прыкмецілі два "хвасты". Іх дагналі дзве легкавушкі і прыціснулі да борта. Міліцыянеры сказалі, што яны едуць "на крадзенай машыне". Адвезлі ў Ленінскі РАУС, затым ноч пратрымалі ў перапоўненай камеры. Зранку павезлі ў суд, дзе ў тэмпе далі штраф на 200 тысяч рублёў за дробнае хуліганства і па 100 тысяч рублёў за... "пажарную бяспеку".

Аднаго з удзельнікаў акцыі ўзялі на другі дзень прама на рабочым месцы.

Лідэры БНФ адзначалі, што акцыя была дазволена, прайшла спакойна і мірна. Таму дзеянні праваахоўных органаў сведчаць аб адным — рэжым нервуецца і баіцца новых акцый. А яны не за гарамі. Ужо 2 лістапада апазіцыя адзначыць Дзяды. Мяркуецца, што збор пачнецца на плошчы Якуба Коласа а 12 гадзіне 2 лістапада. 24 лістапада — наступная акцыя, прымеркаваная, як было сказана, да "гадавіны дзяржаўнага перавароту".

Ігар КАВАЛЬЧУК.

Крокі прыватызацыі

Выстаўляецца лот нумар адзін...

Гэтымі традыцыйнымі словамі пачаўся дзесяты аўкцыён у Магілёве, які адбыўся на пачатку кастрычніка.

І адразу ўверх узнялося восем таблічак з нумарамі ўдзельнікаў. Так актыўна пачалася барацьба за памяшканне ў цэнтры горада па вуліцы Першамайскай. Цана расла. Са 150 мільёнаў яна паднялася да 500 мільёнаў рублёў. За яе і набыла збудаванне адна з гарадскіх фірм. Па ўмовах продажу тут павінна з'явіцца прадпрыемства сферы абслугоўвання. І варта спадзявацца, што яно парадуе магіляўчан разнастайным відам паслуг.

Бойка ішоў гандаль і за двухпавярховы цагляны будынак былога гасціннага двара 1790 года пабудовы. Новы гаспадар абавязаўся правесці рамонт і рэканструкцыю. Такім чынам, у цэнтры горада прадоўжыцца жыццё помніка гісторыі і культуры.

Прададзены і яшчэ адзін будынак. Яго купіў мясцовы прадпрымальнік. Дарэчы, першапачатковая цана яго павысілася ў 6,5 раза. Так што магілёўскія бізнесмены праяўляюць немалую цікавасць да будынкаў. А гарадская казна толькі пасля правядзення дзесятага аўкцыёну атрымала мільярд 450 мільёнаў рублёў.

Яўген ТАЎГЕНЬ.

Не могу молчать

"Народная воля" уже касалась скандала, раздуваемого официальными средствами массовой информации Беларуси с подачи Комитета государственного контроля республики в связи с домом по улице Некрасова, 28, который строит Минский тракторный завод. В номере газеты за 19 августа текущего года была напечатана статья политического обозревателя Людмилы Маслюковой под заголовком "Примерно за 40 тысяч долларов депутат Юрий Малумов купил шестикомнатную квартиру у тракторного завода".

Анализируя итоги предпринятого расследования, журналист, в частности, прогнозировал: "Прямая ложь и примитивные подтасовки подпитывали скандал и в той его части, которая касалась нескольких тракторозаводцев, "замазанных" походя вместе с Малумовым. (Та часть дезинформации требует отдельного разбирательства, к ней надо будет вернуться специально. — Л.М.)".

Сегодня повествование, причем от первого лица, продолжает один из ошельмованных тракторозаводцев. Человека, что называется, допекло. В письме в газету подробно изложены обстоятельства, касающиеся автора лично. Редакция предлагает вниманию читателей текст без купюр, с минимальными стилистическими правками. За достоверность информации, содержащейся в публикации, вместе с автором ручается и журналист Л.Маслюкова. В ее досье по дому №28 по улице Некрасова города Минска имеются документы, подтверждающие правоту Анатолия Ивановича Куделевича.

...Все дело в том, что я председатель профкома крупного завода

В редакцию газеты "Народная воля"

Уважаемая редакция!

Обращается к Вам Куделевич Анатолий Иванович, председатель профкома Минского тракторного завода, с просьбой дать на страницах Вашей газеты объективную информацию обо мне, защитив тем самым меня от потока тенденциозной и односторонней информации, которая звучит вот уже три месяца на белорусском телевидении и радио.

Обращаюсь к Вам потому, что больше не к кому обратиться, так как еще 31.07.97 г. обратился с подобным заявлением на телевидение и до сих пор не получил ответа. А суть вопроса в том, что 30 сентября по белорусскому радио в очередной раз прозвучала информация, что я продал свою квартиру в доме на улице Некрасова, нажив при этом многомиллионный капитал. На самом деле эта информация не соответствует действительности.

В связи с этим прошу через Вашу газету сообщить обо мне следующие данные.

Я, Куделевич Анатолий Иванович, проживаю с семьей из пяти человек в двухкомнатной квартире (28,2 м², ЖСК), которую построил в 1976 году за свои средства. На Минском тракторном заводе работаю 21 год на различных должностях, председателем профкома — с июня 1996 года. Состоял на учете по улучшению жилищных условий на МТЗ. Совместным решением дирекции и профкома в ноябре 1996 года был включен в списки застройщиков дома по улице Некрасова для строительства двухкомнатной квартиры площадью 31 м² за счет собственных средств.

За квартиру уплатил сумму, указанную в договоре с организацией "МТЗ-строй", такую же, как и все остальные 60 человек, строящих жилье в этом доме. 30 процентов стоимости квартиры оплатил Минский тракторный завод, согласно принятому на предприятии положению.

Имею справку о декларировании доходов, полученную в налоговой инспекции Ленинского района.

Полностью оплатив стоимость квартиры, получил в Бюро технической инвентаризации (БТИ) технический паспорт квартиры, подтверждающий, что она является моей личной собственностью.

В дальнейшем, в связи с частой болезнью дочери и маленькой внучки, на семейном совете приняли решение обменять эту квартиру на квартиру в микрорайоне Серебрянка, рядом с домом, где проживаем мы с женой и родители моего зятя, чтобы удобнее было оказывать помощь молодой семье дочери.

С этой целью наша семья обратилась в фирму, занимающуюся вопросами обмена и покупки недвижимости. В течение июня—июля нам был предложен вариант обмена, но все это было оформлено как купля—продажа через нотариальную контору. Никаких миллионов я при этом не получил, так как покупатель квартиры по улице Некрасова отдал (через меня) деньги продавцу квартиры по проспекту Рокоссовского. Таким образом, наша семья стала владельцем квартиры в Серебрянке, что в 10—15 минутах ходьбы от дома, где мы проживаем. Сейчас в этой квартире уже прописана семья дочери, куда они вскорости переезжают, после окончания ремонта.

Так скажите, какой государственный, человеческий и моральный закон я нарушил, проработав вместе с женой более 40 лет на государственных предприятиях и не получив от государства бесплатно ни одного квадратного метра жилья, построив две квартиры за собственные средства?

Разве сегодня у нас запрещено производить обмен или продавать жилье? Сотни человек, получив государственное жилье, не заплатив за него ни одной копейки, приватизируют его и продают и никто при этом не говорит, сколько миллионов прибыли они получили.

В доме по улице Некрасова таким же образом, как я, поступили шесть человек — сверловщица, слесарь литейного цеха, слесарь-сборщик, инженер, но о них, естественно, никто ничего не говорит, потому что они рабочие. Я бы мог назвать их фамилии, но имею ли я на это право, ведь менять или продавать квартиру — это личное дело каждого. Но почему одним это можно, а другим нельзя? Ведь закон один на всех, как говорится, перед ним все равны. Но о них никто не говорит ничего ни по телевидению, ни по радио. Хотя все эти данные имеются в соответствующих государственных органах, как и то, что я не просто продал квартиру, а обменял. Сегодня тракторный завод строит жилье в семи домах, так что же, получившие там жилье более 500 человек не имеют права обменять или продать свои квадратные метры?

Все дело в том, что я председатель профкома крупного завода, и рабочим хотят показать, вот они какие плохие профсоюзы. В глазах жителей республики получается, что я враг народа, который продает квартиры, в то время когда тысячи людей не имеют жилье.

На меня вылито столько грязи, что знакомые при встречах или опускают глаза или переходят на другую сторону улицы. Мои пожилые родители живут в деревне и не могут выйти на улицу. Все это привело к тому, что эти строки я пишу, находясь в больнице, куда попал с сердечными приступами и высоким артериальным давлением. Но нашему телевидению и радио этого мало, они успокоятся, когда я буду (не дай Бог) находиться где-нибудь в районе Северного кладбища.

Анатолий КУДЕЛЕВИЧ, председатель профкома МТЗ.

Віншуем!

Законы вучым разам

Першую гадавіну свайго існавання адзначыла Беларуская асацыяцыя студэнтаў права. Гэтая арганізацыя аб'яднала ў сваіх радах студэнтаў-юрыстаў дзяржаўных і недзяржаўных ВНУ. Галоўная мэта асацыяцыі — павышэнне прафесійнага ўзроўню будучых правазнаўцаў, набліжэнне яго да сусветных стандартаў. Дыспуты і семінары, сустрэчы з вядомымі беларускімі і замежнымі юрыстамі, аказанне прававой дапамогі насельніцтву — вось толькі некаторыя напрамкі дзейнасці гэтай асацыяцыі. Напярэдадні гадавіны выйшла ў свет выданне БАСП — часопіс "Res Nova" ("Новая справа"), у якім маладыя юрысты знойдуць для сябе многа цікавага.

Сяргей ШАГОЛЬСКІ.

Курсы обмена наличных валют в коммерческих банках и официальный курс, установленный Национальным банком на 13 октября 1997 г. (по состоянию на 9.50)

Наименование банка	USD		DM		RUR		Телефон для справок
	Покупка	Продажа	Покупка	Продажа	Покупка	Продажа	
Минск (0-172)							
Абсолютбанк	27800	28060	16100	16130	4,69	4,71	636-080
Белагропромбанк	28060		16120		4,70		285-716
Белбизнесбанк (гл. опер. упр.)	28060	28060	16000	16130	4,70	4,71	769-531
Белбизнесбанк (гор. дир.)	27500	28060	15850	16130	4,62	4,71	271-960
АКБ "Золотой талер"	28060		16130		4,71		267-597
Минский транзитный банк	28050	28060	16100	16130	4,70	4,71	132-916
Ф-л "Милавица" АКБ "Минский транзитный банк"	28050	28060	16120	16130	4,70	4,71	372-825
Ф-л Мосбизнесбанка	27900	28060	15900	16130	4,66	4,71	286-278
Народный банк	27800	28060	15980	16130	4,67	4,71	238-610
"Новоком"	28050	28060	15900	16130	4,70	4,71	603-402
Приорбанк	27900	28060	16000	16130	4,65	4,71	455-721
РРБ	27960	28060	16030	16130	4,63	4,71	266-941
"ФФФ"	28050	28060	16110	16130	4,70	4,71	621-601

Информация предоставлена ПКФ "Агентство Гревцова". Тел./факс (017) 262-16-17.

Демократия по-белорусски

Геннадий БАРБАРИЧ

Не засудишь оппозиционера – слетай с работы...

Первые сентябрьские суды над оппозиционерами показали — власти хорошо подготовились к “Осени-97". Выводы по итогам "горячей весны" сделаны, и все лето, в отличие от бунтарей, копавшихся на огуречных грядках, власти готовили контрудар. Одной из составляющих осеннего контрнаступления должны стать суды.

Августовско-сентябрьские процессы над организаторами шествия митинга 27 июля, в День независимости, Валентином Асташинским, Николаем Статкевичем и Станиславом Гусаком, проходившие в разное время у разных судей, закончились на удивление одинаковыми решениями — максимальные штрафы по 150 “минималок” с каждого. А тут еще судебные исполнители вспомнили про Антончика, который, два года назад проиграв иск “президентскому завхозу” Титенкову, должен выплатить ему на “бедность” аж 200 миллионов рублей. Недавно у Антончика описали тахту и два кресла. Остальное он обещал сам привезти и свалить у президентской Администрации — “пускай подавятся!”.

Похоже, что вместо “суток арес- [illegible] фов. Прекращено производство шести дел и одно приостановлено. Общая сумма штрафов составляет 410 миллионов рублей, из которых взыскано 32 миллиона 800 тысяч рублей, то есть 13,5%.

Здесь сквозь серый чиновничий язык словно сквозит досада — мало! Видимо, власть всерьез верит бредням о мешках с долларами, на которых сидит оппозиция. Поверила, и потому основной причиной низкой уплаты штрафов посчитала не отсутствие этих мешков, а “безответственность судей и судебных исполнителей, а также отсутствие надлежащего контроля за их деятельностью... Судебные исполнители при попустительстве со стороны судей, зная о месте работы должников, не направляли туда постановления для взыскания сумм штрафа...” А попробуйте-ка взыщите 30 миллионов из дохода белорусского ученого, преподавателя или пенсионера. “В ряде случаев судебные исполнители несвоевременно возбуждали исполнительные производства и длительное время не производили никаких действий, направленных на принудительное взыскание сумм штрафа”, — говорится в записке, и затем приводится длинный список судов и фамилии их работников, которые, по мнению авторов, эти нарушения допустили.

Отдельным пунктом стоит в записке уличная деятельность депутатов Верховного Совета 12-го и 13-го созывов: “Особо следует отметить факторы волокиты по делам об административных правонарушениях, совершенных бывшими депутатами Верховного Совета...” Зная особую нелюбовь Александра Григорьевича к бывшим коллегам по депутатскому корпусу, живо представляешь, как сжались кулаки, заиграли желваки на скулах, недобро прищурились глаза: “Это заговор!”.

А докладная все бьет в ту же точку. “Так, направленное из суда Советского района 28 мая постановление в отношении Карпенко Г.Д. в суде Фрунзенского района до 20 июня находилось без движения и регистрации”. Потом, правда, выяснилось, что это не так. Но дело уже сделано. В докладной совбеза в том же духе разобраны дела еще шестерых депутатов и политиков: Валентина Голубева, Павла Козловского, Василия Новикова, Мечислава Гриба, Бориса Гюнтера и Анатолия Лебедько. Заканчивается цитируемый документ требованием к Минюсту наказать провинившихся судей и судейских чиновников — вплоть до освобождения ими занимаемых должностей.

Эта докладная поразила даже видавших виды юристов откровенным и наглым вмешательством исполнительной власти в дела охраняемой Конституцией судебной системы. Подобное стесняются делать даже диктаторы в “банановых” республиках. Документ шокировал холодной чиновничьей жестокостью и, как выразился один видный юрист, невиданным крохоборством. А еще — количеством неточностей, ошибок, описок. Они бросаются в [illegible] возвращен в суд 14 мая. 4 июня Козловским была уплачена часть штрафа в 1,5 миллиона рублей. А в настоящее время в суде выплачена вся сумма. Козловский, все лето понемногу вносивший деньги, даже запутался в квитанциях и переплатил полтора миллиона.

Еще в одном пункте докладной говорится: “Направленное из суда Советского района 28 мая постановление в отношении Г.Д.Карпенко в суде Фрунзенского района до 20 июня находилось без движения и регистрации”. Проверка управления юстиции не подтвердила и этот факт. Постановление действительно было направлено во Фрунзенский суд, однако затем возвращено обратно для надлежащего оформления. А “27 июня и.о. судьи Криволаповым И.В. ... постановление суда от 14 мая отменено, Карпенко Г.Д. от административной ответственности (штраф в 19 млн. 500 тысяч) освобожден”. Сам Карпенко, пока названное постановление переводилось из суда в суд, лежал в больнице и дома с высоким давлением в прединфарктном состоянии. Наверное, с точки зрения чиновников совбеза, правильно было бы конфисковать и вытащить из-под вице-спикера кровать. Поэтому 21 июля власть решила исправить эту недоработку. Председатель Мингорсуда отменил постановление, освобождающее Карпенко от наказания, а материал направил в тот же Советский суд для нового рассмотрения.

Далее докладная гласит: “В.Н.Новиков привлечен к ответственности постановлением судьи Партизанского района Ройник Н.И. от 17.03.1997 года и подвергнут штрафу в размере 5 миллионов...” Опять ошибка — не 17 марта, а 17 апреля состоялся суд. В документе Совета безопасности ошибки и описки, судя по всему, стали системой. И так по каждому из известных политиков — если нет цифровых искажений, [illegible] пенсии Захаренко Ю.Н. удержано 1.254.200 рублей... Постановление от 9.04.97 г. (суд Фрунзенского района) в отношении Лебедько А.В. не исполнено в связи с тем, что нарушитель препятствует его исполнению. Изучение данного исполнительного производства показало, что судебным исполнителем Казюк З.А. 29.04.97 г. в адрес ГАИ, ГУВД Мингорисполкома и БТИ г.Минска направлены запросы о наличии имущества гр-на Лебедько. 18.06.97 г. ему направлено извещение о производстве 25.06.97 г. описи его имущества. 29.07.97 г. происходило выбытие судебного исполнителя по месту жительства нарушителя, однако дверь квартиры никто не открыл...

В связи с неуплатой штрафа в добровольном порядке гр-ном Богданкевичем С.А. по месту получения им пенсии 20.05.97 г. направлено предложение об удержании суммы штрафа... Изучение исполнительного производства в отношении Ходыко Ю.В. показало, что постановление о наложении штрафа в сумме 3 млн. рублей исполнено частично, по месту работы нарушителя из заработной платы Ходыко Ю.В. удержано 1.675.000 рублей... Постановление судьи Партизанского района о... наложении штрафа в размере 5 млн. рублей в отношении Гюнтера Б.Д. направлено на рассмотрение в суд Ленинского района и до настоящего времени не исполнено. Нарушитель не работает и, согласно сведениям, содержащимся в исполнительном производстве, не имеет имущества, на которое может быть обращено взыскание. (Та же история со Щукиным, который в этом документе не упоминается, но по 9 составленным в этом году документам был оштрафован более чем на 50 млн. рублей, но Валерий Алексеевич также не обладает имуществом...)

В суде Московского района в отношении Голубева В.Ф., привлеченного к ответственности в виде штрафа в размере 3 млн. рублей, 19.06.97 г. судебным исполнителем по месту работы нарушителя направлено предложение об удержании суммы штрафа из заработной платы. По имеющимся в исполнительном производстве сведениям, на 7.08.97 г. из зарплаты Голубева удержано 500.000 рублей. Однако деньги не перечисляются “из-за отсутствия денежных средств на расчетном счету учреждения”.

И далее следует: “по фактам волокиты при исполнении постановлений и несвоевременного заведения исполнительных производств рядом судебных исполнителей... к виновным лицам приняты меры дисциплинарного воздействия”. Свыше 10 судей и судебных исполнителей были лишены премий за июнь — июль, нескольким объявлены строгие выговоры. Отдельные судьи до сих пор в неизвестности, в подвешенном состоянии, по слухам, решается вопрос об их увольнении.

Известный адвокат Надежда Дударева, комментируя процитированные документы, пошутила: “За то, что оппозиционеры, как и большинство населения у нас, оказались не такими богатыми, как это кое-кому казалось, отвечать будут судебные исполнители и судьи. По моим сведениям, и докладная записка, и последовавшие меры готовились в огромной спешке, буквально за несколько дней. Потому такое количество неточностей, ошибок, которые просто превращают этот документ в дезинформацию. И эта дезинформация ложится на стол президенту! А на ее основании июльское совещание в управлении юстиции проводилось так экстренно, что были прерваны многие судебные процессы”.

Зачем все это делалось? Не только, чтобы выбить штрафы. Как сказал один молодой юрист, идет явное “закручивание гаек”. И власти, подмяв под себя сначала адвокатуру, стремятся сломать и полностью подчинить судебную систему, а затем послушным судебным “катком” окончательно раздавить оппозицию. Они хотят добиться, чтобы суды, вся судебно-правовая, правоохранительная система действовали четко и по приказу. Чтобы законы были не на первом месте, как это положено, а на том, где скажет власть. Но если властям удастся сделать это, то остановить работающую на полную катушку юридическую систему будет непросто. Хрестоматийные примеры, когда молох репрессий пожирал своих же создателей, похоже, не пугает никого из белорусских “экспериментаторов”. Они не верят, что через год-другой окажутся пособниками каких-нибудь мусульманских экстремистов, готовивших покушение на...

Слово “суд” однокоренное со словом “судьба”... В судах решаются судьбы людей. Даже страшно подумать: если ошибется судья — это перечеркнута и сломана чья-то жизнь, убито чье-то возможное счастье. Судья, как и хирург, должен работать точно, честно, с совестью и без страха. В судах, как и в операционных, должна быть тишина и чистота, но особая чистота — не инфицированная патологически разлагающейся властью. Телефонное право, а равно и другие “наезды” властей раз и навсегда необходимо приравнять к взятке в особо крупных размерах. Какая разница — судью заставляют, запугивают или покупают? Во всех случаях это преступление.

А пока судей — элиту общества — прилюдно “шпыняют”, как безбилетников. Но этот “госнаезд” имеет и обратный эффект — увеличивается уход квалифицированных специалистов. В судах стоит возмущенный шепот — “это безобразие, беспредел невиданный”. Шепчутся, потому что боятся притаившихся где-то под обязательным гербом и портретом Лукашенко подслушивающих “жучков”-скорпионов. Конечно, не надо срываться на крик. Но обрести нормальный, твердый голос и отстоять свои профессиональные и человеческие права — жизненно необходимо.

P.S. *Я располагаю также документом, из которого видно, каким наказаниям подвергаются те, кто не проявляет должного рвения в устрашении оппозиционеров. Речь идет не только о выговорах и строгих выговорах, лишении премий на 30—50, а то и на 100 процентов, но и о других санкциях. Словом, карательный механизм раскручивается...*

Чулі?

Як адмена візіту Аляксандра Лукашэнкі адбілася на планах “Слаўнафты”

Праграмай няздзейсненага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Яраслаўскую вобласць прадугледжвалася паўтарагадзіннае знаходжанне беларускага прэзідэнта на мясцовым нафтаперапрацоўчым заводзе. З'яўленне гэтага прадпрыемства на маршруце высокага мінскага госця не было выпадковым. Яраслаўскі завод-гігант уваходзіць у лік асноўных структурных адзінак “Слаўнафты” — акцыянернай нафтагазавай кампаніі, якая сёння належыць адначасова Расіі і Беларусі.

Дык вось, прэзідэнт “Слаўнафты” Анатоль Фамін павінен быў тут асабіста сустрэць кіраўніка нашай краіны, каб азнаёміць яго з амаль завершаным тэхнічным праектам па паляпшэнні эканамічнай эфектыўнасці прадпрыемства. Сутнасць праекта — ва ўкладанні замежных інвестыцый у мадэрнізацыю завода з мэтай больш якаснай перапрацоўкі нафты. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што менавіта гэты праект меркавалася ажыццявіць летась на Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе, акцыі якога часткова належаць “Слаўнафце”. Але паколькі яна не мае кантрольнага пакета акцыянернага капіталу Мазырскага НПЗ, то мусіць “гуляць” у Беларусі па правілах А.Лукашэнкі. Эканамічная ж палітыка апошняга, як вядома, не адпавядае міжнародным стандартам, у выніку чаго замежныя інвестары адмовіліся прафінансаваць праект на беларускім прадпрыемстве. Вось чаму “Слаўнафта” мусіла мяняць свае планы на Яраслаўль, нягледзячы на тое, што эканамічныя вынікі ад рэалізацыі праекта ў Беларусі былі б для акцыянераў Мазырскага НПЗ болей важкімі.

Як няцяжка зразумець, пад час яраслаўскага візіту кіраўнік нафтагазавай кампаніі меркаваў перакanаць А.Лукашэнку саступіць ёй кантрольны пакет акцый мазыранаў, каб гэткім чынам прыцягнуць на рэканструкцыю беларускага завода замежныя інвестыцыі. Пытанне, аднак, у тым, ці пайшоў бы А.Лукашэнка насустрач А.Фаміну, паколькі страта кантролю над мазырскім прадпрыемствам мае для прэзідэнта Беларусі прынцыповае значэнне. Першая асоба нашай краіны, як вядома, мае хваравітую цягу кіраваць усім і ўся.

Тым часам узаемаадносіны “Слаўнафты” і беларускай дзяржавы падаюцца айчыннымі афіцыйнымі СМІ як узор рэалізацыі саюзных дамоўленасцяў Масквы і Мінска ў эканамічнай сферы. Падставаю для такіх ацэнак служыць толькі што скончаны аўкцыён “Слаўнафты” па продажы акцыяў кампаніі для грамадзянаў Беларусі. Адначасова такі ж аўкцыён кампанія арганізавала і ў Расіі для яе грамадзянаў, які, між іншым, яшчэ працягваецца. І хаця пакет выстаўленых на продаж акцый “Слаўнафты” — 2,17 працэнта — мізэрны з пункту гледжання пераразмеркавання яе ўласнасці, прапагандысцкі шум вакол аўкцыёну моцны ў нашай краіне. А тлумачыцца ўсё вельмі проста. Ініцыятарам мерапрыемства з'яўляецца не хто іншы, як А.Лукашэнка. Нафтагазавая кампанія адгукнулася на яго зварот да Барыса Ельцына інтэграваацца дзвюм краінам у энергетычнай сферы шляхам забеспячэння доступу беларусаў да ўласнасці “Слаўнафты”. Вынікі гэтага аўкцыёну мяркуюцца падвесці ў сярэдзіне кастрычніка, аднак спецыялісты ўжо зараз адзначаюць, што ініцыятыва прэзідэнта Беларусі будзе мець нізкі эфект для нашых суайчыннікаў.

У рэчышчы гэтых “узорных” узаемаадносінаў згаданых партнёраў трэба разгадаць і дадзенае 30 верасня А.Лукашэнкам інтэрв'ю тэлевізійнай службе нафтагазавай кампаніі, у якім карэспандэнт “Слаўнафты” быў праінфармаваны па шырокім спектры беларуска-расійскіх узаемадачыненняў.

Як стала вядома з неафіцыйных крыніц, кіраўніцтва кампаніі ў абмен на спрыянне бізнес-планам “Слаўнафты” паабяцала А.Лукашэнку “пракруціць” гэтае інтэрв'ю па каналах некаторых рэгіянальных тэлестудый Расійскай Федэрацыі. Згаданая здзелка сведчыць, што прэзідэнт Беларусі па-ранейшаму жыва зацікаўлены ў захаванні ў Расіі свайго іміджу першай асобы ў справе міждзяржаўнай інтэграцыі. Пасля таго, як ён стаўся персонай нон-грата ў расійскіх рэгіёнах, з'яўленне забароненага “інтэгратара” на мясцовых тэлеэкранах, трэба меркаваць, будзе мець павышаную ўвагу. Але ж і атрымліваецца, як у камедыі: калі чалавека не пускаюць у хату праз дзверы, дык ён лезе туды праз акно.

Міхал ХВАЙНІЦКІ.

Стоп-кадр



В Бресте состоялся второй Международный фестиваль театрального искусства “Белая вежа”. Девять стран — Беларусь, Россия, Украина, Австрия, Венгрия, Кипр, Литва, Монголия, Польша — представили здесь свои театры. Зрителям был предложен двадцать один спектакль.

На снимке: *сцена из спектакля Брестского театра драмы и музыки “Любовь — книга золотая”.*

Фото Романа КОБЯКА, БелТА.

Концертные новости

Андрей Макаревич “Машину времени” на “Папоротник” не променял

Патриарх российского рока, руководитель группы “Машина времени” Андрей Макаревич представил на днях свою новую акустическую программу, разработанную совместно с музыкантами из квартета “Папоротник”.

По словам Макаревича, со своими новыми коллегами он познакомился в начале лета. Собственно, тогда и возникла блестящая мысль сделать проект в составе: скрипка, контрабас, аккордеон, ударные. “Я уже много лет работаю с гитарой, образно говоря, в одиночестве. Для меня это своего рода бардовская отдушина. Но я, откровенно говоря, все же тосковал по акустическим инструментам”, — комментирует музыкант.

К счастью, совместная работа с музыкантами из “Папоротника” ни в коем случае не означает, что мэтр российской рок-музыки бросит “Машину времени” на произвол судьбы. Как сказал сам мэтр, в последний год его группа особенно дружна и плодотворна...

К сведению: новая программа составлена преимущественно из последних композиций Андрея Макаревича, написанных в жанре шансон. Между прочим, в скором будущем все они вместе с произведениями Александра Вертинского и песнями каторжан войдут в новый “Женский альбом”.

Кстати, если не произойдет ничего из ряда вон выходящего, то 31 октября в концертном зале “Минск” Могилевская областная филармония представит “Машину времени” с программой “Картонные крылья”. Рекламную поддержку концерта обеспечивает группа “Класс-клуб ДжасКрафт”. Цены на билеты — от 200 тысяч до 1,2 миллиона белорусских рублей.

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

Слышали?

Добровольский и Романчук отправились в Европу. Через Блэкпул...

Объединенная гражданская партия установила тесные контакты с рядом европейских общественных и политических организаций. Члены ОГП Александр Добровольский и Ярослав Романчук отправились в Блэкпул. В этом прибрежном городе, находящемся недалеко от Манчестера, проходит конференция Консервативной партии Великобритании. На конференции британские консерваторы намерены обсудить планы своих дальнейших действий в новых условиях.

Посланцы ОГП встретятся с членами парламента Великобритании, руководством Консервативной партии, представителями Республиканской партии США и правоцентристских партий Европы. Кроме того, запланированы встречи с представителями Великобритании в таких ведущих европейских организациях, как ОБСЕ и Совет Европы. В субботу Александр Добровольский выступит на конференции с докладом о ситуации в Беларуси.

Пресс-центр ОГП.

...А Германия “семинарит” в Беларуси

При финансовой и организационной поддержке федерального министерства территориального планирования, строительства и градостроительства ФРГ ежегодно в различных странах Европы проводятся международные семинары.

Очередной, IX, семинар проводится в Минске в период с 14 по 17 октября 1997 года. В нем участвуют представители из Албании, Армении, Беларуси, Болгарии, Венгрии, Германии, Латвии, Литвы, Польши, России, Чехии, Эстонии и других стран — всего 65 человек.

Елена СЫС.

Дзень у гісторыі

15 кастрычніка

У 70 г. да н.э. (гэту ўдакладненую дату падае 4-ты том сучаснай “Беларускай энцыклапедыі”) нарадзіўся старажытнарымскі паэт **Вергілій**. Яго творчасць — вяршыня рымскай класічнай паэзіі — зрабіла вялікі ўплыў на еўрапейскія літаратуры, у тым ліку на лацінамоўную паэзію Беларусі (Я.Вісліцкі, М.Гусоўскі). Існуе ананімная беларуская паэма “Энеіда навыварат”... Дарэчы, Вергілій разглядаў вёску як апору дзяржавы, што вельмі блізка традыцыйным беларускім уяўленням.

У 1814 г. нарадзіўся **Міхаіл Лермантаў**. У 1837 г. ён быў высланы на Каўказ за верш “На смерць паэта”. У змрочную эпоху рускага царызму развіваў “вольныя ідэі” дзекабрыстаў. У Лермантава ёсць паэма “Баярын Орша”, у якой намалявана яскравы вобраз барацьбіта за свабоду.

У 1817 г. у Салюры (Швейцарыя) памёр **Тадэвуш Касцюшка**, палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай беларускага паходжання, кіраўнік вызвольнага паўстання 1794 г. Прах Касцюшкі быў перавезены ў Кракаў (“Нарадзіўся я ліцьвінам...”).

У 1833 г. памёр **Міхал Клеафас Агінскі**, дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, дыпламат і кампазітар, аўтар славутага паланеза “Развітанне з Радзімай”. У 1811 г., маючы званне сенатара, ён падаў расійскаму імператару Аляксандру I праект заснавання аўтаномнага Вялікага герцагства Літоўскага ў складзе Расійскай імперыі. Пасля па невядомых прычынах адышоў ад палітычнай дзейнасці, з 1823 г. жыў у Італіі.

У 1916 г. была заснавана **Беларуская настаўніцкая семінарыя** ў г.Свіслач (Гродзенская вобл.).

У 1932 г. у **Белавежскай пушчы** пачалася забастоўка рабочых лесапрацоўкі.

У 1947 г. у Мінску заснавана **мастацкае вучылішча** (з 1969 г. імя А.К.Глебава).

У 1964 г. быў уведзены ў дзеянне нафтаправод “Дружба”, які праходзіць па тэрыторыі Беларусі.

Старонкі храналогій гартаў Юльян ГРЫГАРОВІЧ.

Без ретуши

“Льготные” мытарства

В апреле этого года были отменены льготы на растаможку автомобилей для лиц, которые полгода и более находились безвыездно за границей. Смысл этих льгот заключался в символической сумме уплаты за автомобиль при оформлении его на таможне и при постановке на учет в МРЭО. И не только это: в техническом паспорте не указывалось, что этот автомобиль оформлен без права отчуждения в течение двух лет. В то время как все остальные автомобили, пригнанные из-за границы, оформлялись без льгот с уплатой 0,3 экю в зависимости от объема двигателя.

Давайте разберемся, что же нужно было предоставить на таможне при оформлении льготного автомобиля. Всего ничего: четыре штампа о въезде и выезде из республики, то есть штамп наших пограничников и, к примеру, польских на выезд-въезд, и через шесть месяцев то же самое, только наоборот. И все, больше ничего не требовалось.

Кто же пользовался этими льготами? В первую очередь это представители дипломатического корпуса, по долгу службы находящиеся за границей долгое время, а также те, кто официально работал на стройках или в сельском хозяйстве. А вот документов, подтверждающих это, никто не требовал.

Тот, кто уехал за границу и в течение полугода зарабатывал там деньги, не оформляясь официально и не платя налоги в казну нашего государства, также имел право на эту льготу. Рэкетир, “путешествующий” с целью сбора дани для “братвы”, тоже имел льготы. Преступник, отсидевший срок в иностранной тюрьме или скрывающийся от преследования, мог приехать в Беларусь на автомобиле и льготно его оформить. Так где же справедливость?

А ведь все остальные граждане Беларуси, честно работающие на территории своей страны и исправно уплачивающие налоги, должны были платить умопомрачительные суммы за растаможку автомобиля. Возникает вполне логичный вопрос: для кого же эти льготы создавались? Не секрет, что львиная доля автомобилей, колесящих по дорогам Беларуси, пригнана из-за рубежа. Естественно, что все, кто покупает там машины, хотят, чтобы они им обошлись подешевле. И вот автомобилисты, каждый, как мог, стали “ухитряться” оформить свой автомобиль с наименьшей потерей денег. В результате всего этого на территории нашей республики появилось много людей, которые “работали” за границей полгода. Длилось это недолго. Скоро соответствующие органы заинтересовались этим делом. И грянули тотальные проверки всех льготников!

А какими методами пользуются сотрудники милиции при выяснении обстоятельств пребывания вышеупомянутых лиц за границей! Не будем говорить об обычных методах опроса подозреваемых лиц. Коснемся лишь тех, которые выходят за обычные рамки. К примеру, приходят в дом к пожилому человеку несколько сотрудников милиции и едва ли не силой доставляют его к себе в кабинет. Ни о какой повестке даже и не упоминается. А на допросе начинается... запугивание и подвалом, и лишением пенсии, и долгим сроком заточения. А допрос может длиться до шести-семи часов. После такой “беседы” любой человек чувствует себя не в своей тарелке. Сотрудники правоохранительных органов могут навещать человека, который якобы скрывается, и рано утром, и поздно вечером. Начинается настоящее преследование. Про официальные повестки никто даже и не вспоминает. Если же улик, имеющих вес, нет, то наши “пинкертоны” могут приехать в школу и допросить несовершеннолетнего ребенка, были ли его родители или бабушка с дедушкой за границей в течение полугода.

Положение о льготах отменили еще в апреле этого года, а многим людям до сих пор нет покоя. Их продолжают “пытать”, что же они делали в 1995—1996 годах.

Я понимаю, что не все машины были оформлены с соблюдением всех правил, может быть, кто-то и заслуживает наказания. Но неужели мы, жители цивилизованной европейской республики, в конце двадцатого столетия не имеем права на корректное отношение к себе со стороны правоохранительных органов?

Обращаясь к нашему президенту, хочу сказать: “Александр Григорьевич! Обидно, когда наше правительство само дает льготы преступникам и тем гражданам, которые не платят налоги в казну государства. А если случилось так, что многие клюнули на закинутую приманку и нарушили закон, то в этом нужно винить и наших правителей”.

А.МОЖЕЙКО, участник событий.

г.Пинск.

Жыццё, як яго бачыць журналіст Уладзімір Шык

Сёння яшчэ ездзім, а заўтра?

Яшчэ больш прысыпаў узмоцнены парывамі ветру халодны восеньскі дожджык. Людзей на прыпынку істотна прыбавілася, а жаданага аўтобуса ўсё так і не было. Пасажыры нервова паглядвалі на гадзіннікі, бо многія спазняліся на працу. Яны не маглі ведаць, што на лініі якраз адбылася чарговая паломка машыны. І калі толькі праз 20 хвілін пад'ехаў наступны па графіку аўтобус, пачаўся яго сапраўдны штурм...

Згаданы эпізод з жыцця — тыповы і далёка не адзінкавы ў сённяшняй беларускай рэальнасці. Штодзень падобныя стрэсы перажываюць як сталічныя пасажыры, так і жыхары самых аддаленых куточкаў краіны. Знаёмы мой аўтамабіліст з вялікім практычным вопытам неяк у гутарцы пра сённяшнія праблемы галіны трапна заўважыў: “Няма тут нічога дзіўнага, бо калі краіна бяднее, то і транспарт ”хварэе". У гэтым, сапраўды, лёгка пераканацца.

Возьмем да прыкладу буйнейшую аўтагаспадарку Віцебшчыны — дзяржаўнае аўтапрадпрыемства №1, размешчанае ў абласным цэнтры. Кожны месяц яно перавозіць 5 мільёнаў пасажыраў — лічы палову насельніцтва рэспублікі. Дык вось 70 працэнтаў працуючай тут тэхнікі трэба спісваць. У другім па велічыні горадзе ў вобласці — Оршы — са 154 працуючых аўтобусаў 59 эксплуатуюцца больш за 10 гадоў, а 40 машын даўно выслужылі свой тэрмін. Сітуацыя на перыферыі таксама не з лепшых.

Узрост аўтобуснага парка ў Пастаўскім АТП №17, некалі адным з лепшых у вобласці, зараз складае 8—16 гадоў. Істотна — на 30 працэнтаў — скарацілася тут і колькасць грузавых машын. Засталося ў гэтай аўтагаспадарцы толькі 50 грузавых адзінак, але і яны выкарыстоўваюцца цяпер толькі на сезонных работах. Месяцамі стаяць машыны на прыколе, а вадзіцелі сядзяць без працы. Але ж менавіта дзякуючы грузавым аўтаперавозкам выжывае ўвесь гэты парк у цэлым.

З сумам адзначае яго дырэктар У.У.Стрэчань пра рэзкае скарачэнне ў апошні час пасажырапатоку як на мясцовых, так і на аддаленых маршрутах. Калі яшчэ ў пачатку сёлетняй вясны штомесячная выручка ад гарадскога транспарту складала 250—260 мільёнаў рублёў, то ў апошнія месяцы яна ўпала больш чым на 100 мільёнаў. Што зробіш, нават білет на разавую паездку ў аўтобусе становіцца не па кішэні асобным грамадзянам. Усё радзей стараюцца ездзіць людзі па сваіх справах, толькі ў выпадку крайняй неабходнасці. Часцяком возяць аўтобусы пустыя салоны.

Прайшлі тыя часы, калі пастаўчане ганарыліся, што набылі пяць новых “Ікарусаў”. Сёння з ранейшых васьмі засталіся толькі два міжгароднія маршруты на Мінск і Вільнюс. Няма ўжо рэйсаў на Ліду і Гродна, Наваполацк і Даўгаўпілс, нават на Маладзечна. Перасталі ездзіць нядаўна і ў абласны цэнтр, бо панеслі на гэтым маршруце за 7 месяцаў страт на 90 мільёнаў рублёў. Самае трывожнае, аднак, не гэта. Усе аўтамабілісты, з кім даводзілася размаўляць, у адзін голас зазначалі, што недалёка засталося да таго часу, калі ўзровень зношанасці тэхнікі перавысіць крытычна дапушчальны ўзровень, пасля чаго аднавіць нармальную дзейнасць галіны стане проста немагчыма.

Шмат прычын прывялі да няпростага сённяшняга стану аўтатранспарту. “Міна запаволенага дзеяння”, лічу, была закладзена тады, калі разам з абвяшчэннем суверэнітэту Рэспублікай Беларусь доўгія гады ды і зараз дзейнічала яўна заніжаная цана за праезд, якая не пакрывала ўсе затраты транспартнікаў. Меркавалася, што розніца паміж існуючай цаной перавозкі і рэальным коштам праезду будзе кампенсавацца з абласных, гарадскіх, раённых бюджэтаў. У рэальнасці з-за недахопу сродкаў мільярдныя даўгі іншы раз проста павісалі ў паветры. Між іншым да нядаўняга часу ў 400-тысячным Віцебску бясплатна каталіся 179 тысяч розных ільготнікаў, не лічачы дзесяткаў тысяч шматлікіў “зайцоў” — безбілетнікаў.

Так бы ўсё і ішло сваім ходам, пакуль сур'ёзнасць сітуацыі хоць са спазненнем, але ўсвядомілі ўлады. Больш двух гадоў таму назад спачатку ў Віцебску, а потым у іншых месцах увялі мясцовыя мэтавыя зборы на развіццё транспарту, бо вельмі ўжо былі патрэбныя сродкі на рамонт старой і закуп новай тэхнікі. Было вырашана таксама паўсюдна ўзмацніць кантрольна-рэвізійныя службы пры рэйдах міліцыянерамі, на большасці гарадскіх маршрутаў зноў з'явіліся кандуктары. Паступова ўзрастаў кошт адной паездкі і тарыфаў на перавозкі, адначасова павялічваліся кошты штрафаў для безбілетнікаў. Да гонару аўтамабілістаў, і яны не сядзелі склаўшы рукі.

У згаданым вышэй Віцебскім ДАП-1 асвоілі капітальны рамонт кузаваў “Ікарусаў” і “ЛАЗаў”. Не ад добрага жыцця пачалі рамантаваць рухавікі, наладзілі рэстаўрацыю многіх вузлоў і дэталяў, што раней рабілі спецыялізаваныя прадпрыемствы. Сёння наогул трэба выказаць шчырую ўдзячнасць працы тысяч работнікаў, бо дзякуючы ім зношаны транспарт працягвае трымацца.

Адначасова асвойвалі новыя маршруты ў краіны блізкага і далёкага замежжа, з'явіліся так званыя “чаўночныя” паездкі. Усё рабілася, каб зарабіць такія патрэбныя на ўсё грошы. Жыццё не паралізавалі, бо, як і раней, перавозілі дзетак у лагеры, студэнтаў — на сельгасработы, абслугоўвалі розныя фестывалі, канферэнцыі, выконвалі іншыя заказы.

Нехта запытаецца, чаму ж аўтамабілісты не набываюць новую тэхніку? Зрабіць гэта няпроста, калі ведаць, што новы “Ікарус”, у залежнасці ад мадыфікацыі, каштуе прыкладна 100—150 тысяч долараў. Буйнейшыя абласныя гарады — Віцебск, Орша, Наваполацк — спрабавалі купляць аўтобусы “Нёман” Лідскага эксперыментальнага завода, беларускія “Ікарусы”, сабраныя ў Пінску, а таксама быўшыя ва ўжытку машыны з Германіі. Толькі і іх кошт вялікі — 80—90 тысяч “зялёненькіх”. Але і гэтыя адзінкавыя закупкі (8—10 машын) не робяць надвор'я, калі ўлічыць, што ў лепшыя часы столькі адзінак новых аўтобусаў і столькі грузавых машын кожны год набывалі ў адным толькі Пастаўскім аўтапарку. Праўда, сёлета тут рады, што ўпершыню за многія гады здолелі купіць тры новыя аўтобусы “ПАЗ”. Іншыя больш маланаселеныя райцэнтры з-за недахопу сродкаў абнавіць катастрафічна старэючы парк проста не ў стане.

Не абнадзейвае аўтамабілістаў вобласці і прынятая дзяржаўная праграма па выпуску ўласных аўтобусаў. У ёй прадугледжваецца, што зоймуцца гэтым канцэрн “Амкадор” у Пінску, аб'яднанне МАЗ “Неаплан” у Мінску і завод у Лідзе. Толькі зноў жа не так хутка ўсё гэта будзе наладжана. Да таго ж кошт машын высокі. Які ж выхад са склаўшайся няпростай сітуацыі? На маю думку — гэта пераход транспартнікаў на працу па прамых дагаворах з уладамі ўсіх узроўняў на арганізацыю пасажырскіх перавозак, магчыма, у прадастаўленні пэўных падатковых ільгот і доўгатэрміновых мэтавых крэдытаў на тэхнічнае пераабсталяванне.

Выхад таксама — у правядзенні рашучых структурных пераўтварэнняў, у першую чаргу — раздзяржаўленні і прыватызацыі грузавога парка. Пра яго лёс менш гаворыцца, але беды і праблемы ў перавозчыкаў грузаў не меншыя, чым у іх калег па прафесіі. Аднак сустракаюцца і прыемныя выключэнні.

Ужо каля 90 працэнтаў усіх міжнародных перавозак грузаў па вобласці ахоплівае створаная ў красавіку 1994 года віцебская прыватная фірма “Трансэкспедытар”. Пра яе дзейнасць ведаюць у Заходняй Еўропе. Замежныя падобныя перавозчыкі аддаюць сёння перавагу супрацоўніцтву менавіта з такімі недзяржаўнымі структурамі. Амаль пад чэснае слова, а не гарантыі ўрада ці нейкіх там улад. Па лізінгу перадалі фірме новыя прыгажуны цягачы “Івека”, сучасныя паўпрыцэпы, адпавядаючыя сусветным стандартам. Зразумела, з растэрміноўкай плацяжоў на некалькі гадоў.

Транспарт ААТ “Трансэкспедытар” можна сустрэць сёння ў многіх еўрапейскіх краінах і партах, не гаворачы ўжо пра дарогі дзяржаў СНД. З году ў год расце тут выпрацоўка ў тонах і тона-кіламетрах на адну адзінку тэхнікі. Штомесяц дзяржава атрымлівае больш за мільярд рублёў у выглядзе падаткаў, а самі працаўнікі маюць высокія заробкі і ўпэўнена глядзяць у будучае.

...Раней напярэдадні свайго прафесійнага свята — Дня работніка аўтамабільнага транспарту — было прынята гаварыць пра поспехі і дасягненні. Ёсць пэўныя вынікі і сёння, бо імчаць па нашых дарогах аўтобусы і аўтафургоны, бензавозы і цягачы, самазвалы і бартавыя, хоць ручаёк іх прыкметна звузіўся. Айчынны аўтатранспарт, нягледзячы на ўсе свае шматлікія балячкі, працягвае жыць, але, відавочна, чакае дапамогі.

Віцебская вобл.

Народная Воля 15 КАСТРЫЧНІКА 1997 г.

Казахстан

Назарбаев намерен создать "компактное правительство единомышленников"

Президент Нурсултан Назарбаев намерен создать "компактное правительство единомышленников, приверженных идее стратегии развития Казахстана до 2030 года". Об этом Н.Назарбаев заявил на встрече с зарубежными консультантами по вопросам экономики.

Стратегию развития Казахстана до 2030 года президент намерен представить на заседании правительства, парламента, общественности республики.

Говоря о стратегии развития, Н.Назарбаев подчеркнул, что Казахстан "имеет нормальные амбиции выйти в ряд развитых государств". "У Казахстана есть решимость, сохраняя независимость и территориальную целостность, построить демократическое государство с рыночной либерализованной экономикой с учетом национальных традиций", — считает президент.

Таджикистан

Рахмонов издал распоряжение об освобождении 170 сторонников оппозиции

Президент Эмомали Рахмонов распорядился освободить из мест лишения свободы 170 сторонников оппозиции в соответствии с законом об амнистии участникам гражданского противостояния в Таджикистане в 1992—1993 годах.

Такое распоряжение дано главой государства по итогам встречи в Душанбе с лидером Объединенной таджикской оппозиции (ОТО), председателем Комиссии по национальному примирению (КНП) Саидом Абдулло Нури.

Поименный список кандидатов на освобождение из-под стражи уже передан правительству. При этом соответствующее решение будет приниматься после персонального рассмотрения каждого дела, а спорные случаи будут рассмотрены экспертной группой.

Всего, по данным КНП, в заключении находятся около 700 сторонников оппозиции.

Наделали бракованных долларов

Изрядно напортачили печатники из Министерства финансов США. Как сообщает ИТАР-ТАСС со ссылкой на газету "Вашингтон таймс", в правительственном бюро гравировки и печати изготовлена партия бракованных пятидесятидолларовых банкнот нового образца на 7,8 миллиарда долларов.

Качество печати столь низкое, что заметно даже невооруженным глазом. В результате деньги кажутся фальшивыми.

Помимо того, что конфуз может обернуться для американской казны многомиллионным убытком, он уже нанес серьезный моральный ущерб, поскольку вызвал отсрочку дебюта новых купюр с улучшенной защитой. В начале прошлого года США ввели в обращение новые стодолларовые банкноты и объявили, что за ними последуют видоизмененные денежные знаки меньшего достоинства.

Проинспектировав новинку, они отказались принять более 57 миллионов банкнот нарицательной стоимостью почти 2,9 миллиарда долларов.

Теперь специалисты министерства ломают голову над вопросом о том, можно ли все-таки пустить в обращение эти деньги после того, как новый вид 50-долларовых банкнот станет привычным, или же следует просто уничтожить их и отпечатать взамен другие.

Испорченными оказались более 15 процентов из примерно миллиарда 50-долларовых банкнот, которые предполагалось запустить в обращение в конце 1997 — начале 1998 года. Чтобы отпечатать замену, придется истратить до 11 миллионов долларов, ибо стоимость изготовления одной новой купюры считается равной в среднем 7 американским центам.

П.Д.

Литва

Претендент на пост президента Паулаускас надеется на поддержку избирателей – сторонников Бразаускаса

Один из реальных претендентов на пост главы государства, бывший заместитель генерального прокурора, адвокат Артурас Паулаускас в случае победы на президентских выборах "не намерен существенно корректировать внешнюю политику страны". Об этом он заявил на пресс-конференции, отметив, что приоритеты внешней политики Литвы определены давно и остаются довольно устойчивыми.

Согласно итогам опросов, А.Паулаускас в сентябре занимал третье место в списке популярности потенциальных претендентов на пост президента Литвы. Первое и второе места соответственно занимали американский эколог литовского происхождения Валдас Адамкус и нынешний президент Альгирдас Бразаускас. Однако В.Адамкусу ГИК отказал в выдаче бланков для сбора подписей избирателей (жалобу В.Адамкуса на это решение ГИК Вильнюсский уездной суд на днях рассмотрит), а А.Бразаускас заявил, что баллотироваться на пост президента на второй срок не будет.

Таким образом, А.Паулаускас на сегодняшний день является лидером среди претендентов на пост главы Литвы.

Выступая на пресс-конференции, бывший зам.генерального прокурора выразил надежду, что большинство избирателей сторонников А.Бразаускаса отдадут ему свои голоса на предстоящих президентских выборах.

Отвечая на вопросы журналистов, А.Паулаускас допустил, что слова А.Бразаускаса о том, что президентом Литвы должен стать человек нового поколения, относятся именно к нему, самому молодому претенденту на пост главы государства.

А.Паулаускасу — 44 года. С марта 1990 года, сразу после восстановления независимости Литвы, А.Паулаускас занял пост генерального прокурора Литвы, с 1995 года работал заместителем генерального прокурора, в текущем году стал адвокатом.

По материалам "Интерфакса"

Усыновила в России — убила в Америке

Американка Рене Полрейс, признанная виновной в убийстве усыновленного ею в России 2-летнего мальчика, приговорена судом к 22 годам тюремного заключения.

Причиной смерти малыша по имени Дэвид стали многочисленные побои, которые, как было установлено в ходе процесса, нанесла ему приемная мать. По оценкам экспертов, тело ребенка на 90 процентов было покрыто синяками и кровоподтеками.

Несмотря на очевидные свидетельства насилия, адвокат Р.Полрейс пытался доказать непричастность своей подзащитной к гибели ребенка и утверждал, что Дэвид, якобы страдавший психическим расстройством, сам нанес себе смертельные повреждения. На версии самоистязания настаивала и приемная мать, но убедить суд в том, что 2-летний ребенок даже в совершенно не контролируемом состоянии смог нанести себе такое количество синяков и ссадин, не удалось.

ИТАР-ТАСС.

Быть Чарльзу королем

Тунисский астролог Хасан аш-Шарни, точно предсказавший в декабре 1996 года гибель принцессы Дианы, продолжил свои изыскания. Звезды поведали ему, что:

— нынешняя британская королева, по его мнению, в ближайшие два-три года откажется от престола в пользу принца Чарльза, и Соединенное Королевство войдет в новое тысячелетие с новым монархом, царствование которого продлится всего несколько лет;

— принц Чарльз женится на своей подруге Камилле в конце 1998 года: "Они будут счастливы, но призрак Дианы будет преследовать их всегда".

— Чарльза сменит на престоле принц Уильям. Он станет последним королем Великобритании, из состава которой до 2025 года выйдет Северная Ирландия;

— в 1997 году будет убит или умрет естественной смертью один из арабских лидеров (говорят, проблема со здоровьем у Арафата. — Ред.);

— в 1998 году начнется новая арабо-израильская война.

("7 пятниц")

Подробности

Приемный сын Марка Бернеса грозится отдать квартиру отца чеченцам

Спокойную жизнь вдовы Марка Бернеса, Лилии, нарушил ее собственный сын Жак, потребовав недавно от матери разменять их двухкомнатную квартиру.

Так Жак планирует решить свои финансовые проблемы. Всю свою жизнь он жил вначале за счет имени своего приемного отца Марка Наумовича, а потом за счет финансов своих жен. И когда от Жака ушла четвертая по счету законная спутница жизни, ему впервые пришлось задуматься, как жить дальше. Тогда в его голову и пришла бредовая идея разменять квартиру отца. Иначе — поставил Жак ультиматум матери — причитающуюся ему по закону комнату он сдаст чеченцам. О нешуточных требованиях Жака говорит тот факт, что в дверь одной из комнат он уже врезал замок и запер ее на ключ.

Лилия Бернес в отчаянии. Их московская квартира — своеобразный музей Марка Бернеса. Вдова хранит в ней все так, как было при жизни Марка Наумовича. Разменять квартиру, считает она, значит предать память легендарного актера.

Свои права на квартиру расстроенная супруга Бернеса намерена отстаивать в суде, а к городским властям Москвы она обратилась с просьбой организовать в квартире музей.

Мария ВИКТОРОВА.

Память людская

Послание из Сент-Джеймского дворца

Принц Уэльский и его сыновья благодарят всех, кто отправил соболезнования из Беларуси по поводу гибели принцессы Уэльской Дианы и посетил в траурные дни Посольство Великобритании в Минске

Читатели "Народной воли", наверное, слышали, что сотни людей во всем мире направили письма-соболезнования и посылки принцу Уэльскому, принцу Уильяму и принцу Гарри в Сент-Джеймский дворец в Лондон. Объемы корреспонденции огромны, и почтенному семейству, как сообщили в Посольстве Великобритании в Минске, не представляется возможным ответить на каждое из более чем 300.000 посланий, несмотря на то, что принцем Уэльским были приняты все меры к тому, чтобы дать ответ на как можно большее их число.

Вот почему принц Уэльский и молодые принцы обратились через Посольство Великобритании в Минске передать многочисленным представителям народа Республики Беларусь о своей глубочайшей признательности за их добрые чувства и безмерную щедрость, проявившиеся в письмах и посылках, направленных им. Принц Уэльский и его сыновья были чрезвычайно тронуты поддержкой людей во всем мире, которая придала им новые силы в тяжелую минуту.

Письмом-обращением к белорусскому народу принц Уэльский и его сыновья от всего сердца благодарят и передают всем, кто написал или телеграфировал им, выразив свои добрые чувства сострадания и поддержку в трудную минуту.

Авторы послания уверили в том, что все письма ими прочитаны и приняты с благодарностью.

Виталий ЧАУССКИЙ.

Жалезнае шчасце

Цяжка жыць без матацыкла

Сярод мноства мінскіх маладзёжных груповак, аб'яднанняў, клубаў, так званых "тусовак" заўсёды вылучаліся гарадскія рокеры, ці, як іх называюць апошнім часам, байкеры. У людзей старэйшага ўзросту наўрад ці выклікаюць сімпатыю гэтыя хлопцы ў скураных куртках. Хутчэй за ўсё іх прымаюць за правапарушальнікаў. Затое захапленню дзяўчат і юнакоў, калі побач на шалёнай хуткасці праносіцца храміраваны байк, няма канца...

Маладзёжна-грамадскае аб'яднанне "Gross-road" было зарэгістравана ў студзені гэтага года. У перакладзе з англійскай мовы яго назва абазначае "скрыжаванне". Сапраўды, скрыжаванне. Байкеры — гэта не проста аматары матацыклетнай язды, яны фанатычна ўлюбёныя ў тэхніку майстры. З груды абломкаў, якім у іншых абставінах несумненная дарога на сметнік, яны робяць цуд, казку ў метале, абсалютна эксклюзіўны варыянт цяжкавагавага "Дняпра" ці "Урала". На гэта, у лепшым выпадку, патрэбна паўгода, а часцей за ўсё — дзве зімы. Але праца ўзнагароджваецца ўдвая. Па-першае, пачуццём уласнай годнасці — "я гэта зрабіў сам", "у мяне гэта ёсць", па-другое, прызнаннем.

У ліпені беларускія байкеры ўдзельнічалі ў байк-шоу, якое праводзілася ў Маскве. На гэта грандыёзнае свята з'ехаліся тысячы фанатаў з розных куткоў Расіі і бліжняга замежжа. Можна толькі шчыра парадавацца за нашых землякоў. У намінацыі "Самы прыгожы матацыкл" першае і трэцяе месца занялі адпаведна самаробныя "Harley Davidson" Аляксея Вакульчыка і Сяргея Здольнікава з Мінска. Прычым Лёша выступае пераможцам у гэтым конкурсе ўжо другі раз запар. Не так проста было заваяваць павагу напышлівых, самазадаволеных масквічоў, якія спачатку ставяцца да беларусаў як да правінцыяльных "лахоў". Але калі яны на свае вочы ўбачылі тэхніку, на якой прыехалі на шоу нашы хлопцы, то толькі развялі рукамі ад здзіўлення.

Масквічы мелі рацыю, калі дзівіліся. У іх усё наладжана найлепшым чынам: свой клуб з гучнай назвай "Начныя воўкі", шэраг тэхнічных майстэрань, магчымасць праводзіць байк-шоу. Беларускія байкеры не маюць нават свайго памяшкання, дзе маглі б збірацца, дзяліцца ідэямі, "рэстаўрыраваць" старыя мадэлі матацыклаў. На адным энтузіязме далёка не заедзеш. Цяжкасці сутыкаюцца напрамую з фінансаваннем.

Старшыня "Gross-road" Сямён Русаковіч расказвае: "Каб толькі наскрэбці стартавы капітал — справа пайшла б. Калгас "Азярцо", землі якога знаходзяцца ў мяжы горада, прапаноўвае нам памяшканне, якое раней было адрынай. Калі яго адрамантаваць, то ў адной палове можна было б зрабіць кафэ-клуб, а ў другой — майстэрню. Але куды ні кінь — усюды клін. Няма нават гэтых чатырох з паловай мільёнаў на арэнду. Дзяржаўныя чыноўнікі толькі абяцаюць, калі мы звяртаемся з канкрэтнымі прапановамі льготнай арэнды. Хаця маглі б дапамагчы і Асацыяцыі насельніцтва за бяспеку, і Беларускаму клубу агульнай дапамогі і аўтамабільнаму сэрвісу. З часам мы адрабілі б гэтыя грошы. Ёсць шмат сумленных шляхоў заробку, напрыклад аднаўленне антыкварнай тэхнікі, нейкі прыбытак давала б кафэ. Яшчэ адзін бок, які нельга не закрануць. Для міліцыі будзе куды лепей, калі падлеткі прыдуць да нас, будуць вольны час бавіць не за пляшкай і біццём вітрын, а знойдуць сапраўдны мужчынскі занятак".

